Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі універсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 11 (402) | Субота, 26 сакавіка 1960 года. | Цана 10 кап.

*Да 90-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна*

# ЛЕНІНСКІЯ ЧЫТАННІ

★ ★ ★

## На вечар прыходзяць з другіх факультэтаў

ГЭТЫ вечар быў фізфакаўскі. Але ў клубе акрамя фізікаў сабраліся і студэнты іншых факультэтаў, некаторыя навуковыя супрацоўнікі хімфака і матфака, работнікі адміністрацыйна-гаспадарчай часткі. Вечар жа ўваходзіў у цыкл ленінскіх чытанняў, якія праводзяцца ва універсітэце.

Цікавы даклад «Ленін у жыцці» прачытаў дацэнт Г. І. Якуб. Дакладчык прывёў шэраг цікавых фактаў з жыцця правадыра сусветнага пралетарыята. Ён расказаў аб яго прастаце, незвычайнай чуласці да таварышаў па рабоце, уважлівасці да наведвальнікаў і ў той жа час высокай патрабавальнасці да работнікаў ЦК і Саўнаркома. Нельга было без хвалявання слухаць, якім сціплым быў Ленін у жыцці.

Але вось са сцэны гучаць неўміручыя радкі Маякоўскага:

Ленин и теперь
живее всех живых
Наше знанье,
сила
и оружие!

Гэта заслужаны артыст БССР Барыс Канстанцінавіч Кудраўцаў, якога студэнты запрасілі на свой вечар, пачаў чытаць сабраўшымся ўрыўкі з паэм лепшага песняра савецкай эпохі «Хорошо!» і «Владимир Ильич Ленин». Магутная сіла паэзіі Маякоўскага, дасканаласць мастацкага выканання пакарылі залу.

А пасля выступлення Б. К. Кудраўцава клубная сцэна ператварылася ў тэатральную. Перад студэнтамі быў сыграны ўрывак з п'есы савецкага драматурга Н. Пагодзіна «Чалавек з ружжом». У ролі Леніна выступіў народны артыст СССР Павел Сцяпанавіч Малчанаў, у ролі салдата-селяніна Шчадрына—Павел Іванавіч Іваноў, заслужаны артыст БССР. Сыграны ўрывак ярка праілюстраваў цесную сувязь Ільіча з народам, яго ўменне кіравацца ў сваёй практычнай рэвалюцыйнай дзейнасці інтарэсамі народа, уменне прыслухоўвацца да думкі народа.

У заключэнне вечара прысутныя прагледзелі кінафільм «Якаў Свярдлоў», многія кадры якога ўваскрашаюць вобраз вялікага Леніна і яго верных саратнікаў.

**Г. АВЕЧКІН,**
член партыйнага бюро фізфака.

## Ленін—журналіст

ЦІКАВЫ вечар, прысвечаны 90-годдзю з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна адбыўся ўчора на філалагічным факультэце. Перад сабраўшыміся, сярод якіх было нямала будучых журналістаў, з дакладам «Ленін—арганізатар і рэдактар бальшэвіцкага друку» выступіў кандыдат гістарычных навук, намеснік дэкана філалагічнага факультэта Р. В. Булацкі. Ён расказаў аб жыцці і дзейнасці Леніна як літаратара і журналіста. На яркіх прыкладах Рыгор Васільевіч паказаў, якое важнае значэнне надаваў кіраўнік Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы друкаванаму слову, як умела і ўважліва падыходзіў ён да праўкі аўтарскіх матэрыялаў.

Вельмі зацікавіў прысутных і даклад кандыдата філалагічных навук А. А. Лойкі «Вобраз Леніна ў беларускай паэзіі».

**С. СЦІПЛОВІЧ.**

# БЕССМЯРОТНЫЯ ТВОРЫ ЛЕНІНСКАГА ГЕНІЯ

## Новыя выданні твораў У. І. Леніна

Вялікімі тыражамі на многіх мовах народаў СССР друкуюцца бессмяротныя творы ленінскага генія і кнігі аб вялікім правадыру і настаўніку працоўных усяго свету. Да гэтага часу ў СССР выйшла 38 тамоў чацвертага выдання твораў. У. І. Леніна, 36 Ленінскіх зборнікаў. Зараз па пастанове Цэнтральнага Камітэта партыі выходзіць пяты, найбольш поўны збор твораў Уладзіміра Ільіча.

Да 90-годдзя з дня нараджэння заснавацеля і кіраўніка Камуністычнай партыі і першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы Інстытут марксізма-ленінізма пры ЦК КПСС рыхтуе шэраг новых выданняў. Завершана падрыхтоўка да друку трохтомнага збора выбранных твораў У. І. Леніна. У яго ўключаны амаль усе асноўныя работы Уладзіміра Ільіча, якія рэкамендуюцца пры вывучэнні гісторыі КПСС у сістэме партыйнай асветы.

Рыхтуюцца дзве біяграфіі правадыра, адна з якіх разлічана на камуністаў і беспартыйных таварышаў, якія глыбока вывучаюць гісторыю партыі. У гэтым выданні на аснове новых дакументальных матэрыялаў Цэнтральнага партыйнага архіва, успамінаў працоўных, саратнікаў і сучаснікаў Уладзіміра Ільіча найбольш поўна і ўсебакова асвятляецца жыццё і дзейнасць правадыра; раскрыта значэнне ўсеперамагаючых ідэй ленінізма. Другая біяграфія выйдзе аб'ёмам прыкладна ў пяць друкаваных лістоў з ілюстрацыямі. Яна прадназначаецца для самых шырокіх колаў народа.

У 1956 і 1957 гадах вышлі ў свет два тамы ўспамінаў аб У. І. Леніне выдатных дзеячоў Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы, саратнікаў і вучняў Уладзіміра Ільіча, яго родных, старэйшых членаў партыі, якія асабіста ведалі Ільіча, дзеячоў міжнароднага рабочага руху, працоўных і сялян, якія сустракаліся з Уладзімірам Ільічом і слухалі яго выступленні. Рыхтуецца да друку трэці том успамінаў. Артыкулы, што ўваходзяць у яго, адлюстроўваюць жывыя рысы правадыра, трыбуна рэвалюцыі, стваральніка і кіраўніка партыі і Савецкай дзяржавы, вялікага і разам з тым выключна сціплага і простага чалавека. Большасць матэрыялаў, змешчаных у гэтым томе, друкаваліся ў дваццатыя і трыццатыя гады і сталі бібліяграфічнай рэдкасцю. Шэраг успамінаў будзе надрукаваны ўпершыню.

Больш шасцісот хвалюючых чалавечых дакументаў увайшло ў падрыхтаваны да друку калектывам супрацоўнікаў інстытута і Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва СССР зборнік «Пісьмы працоўных У. І. Леніну». Гэта толькі невялікая частка пісем, якія ў першыя гады Савецкай улады пісалі У. І. Леніну рабочыя і сяляне, чырвонаармейцы, вучоныя, радавыя служачыя, камуністы і беспартыйныя. Дакументы зборніка сведчаць аб бязмежнай народнай любві да вялікага правадыра і настаўніка, увасабляюць непарыўную сувязь Камуністычнай партыі і народа.

Да юбілейнай даты аднесена выданне біяграфічнай хронікі «У. І. Ленін у першыя месяцы Савецкай улады» (лістапад 1917 года—сакавік 1918 года). Дзень за днем у ёй адлюстроўваецца шматгранная дзейнасць Уладзіміра Ільіча за гэты кароткі, але вельмі насычаны перыяд яго дзейнасці.

Выйдзе ў свет падрыхтаваная інстытутам першая частка «Храналагічнага ўказчыка твораў У. І. Леніна». Літаратурная спадчына правадыра вялікая. Вядома звыш дзесяці тысяч надрукаваных дакументаў (у 38 тамах чацвёртага выдання твораў Уладзіміра Ільіча, 36 Ленінскіх зборніках, кнігах, часопісах, газетах). Пачатае выданне з'явіцца своеасаблівай энцыклапедыяй усёй вядомай ленінскай літаратурнай спадчыны. У храналагічнай паслядоўнасці ў ім будуць указаны не толькі надрукаваныя выданні прац правадыра, але і яго даклады, прамовы, рэплікі, тэлеграмы, аўтабіяграфічныя дакументы, чарнавыя матэрыялы і г. д. Першая частка ўказчыка ўключае ў сябе творы і дакументы, пачынаючы з 1886 года па люты 1917 года.

Вялікую цікавасць мае таксама альбом фотаздымкаў У. І. Леніна, які выйдзе ў свет да знамянальнай даты. У альбоме будзе 110 фатаграфій; некаторыя з іх друкуюцца ўпершыню.

(ТАСС).

# АБ ЧЫМ РАСКАЗВАЕ ВЫСТАЎКА

НЯМА чалавека, якога б не хваляваў вобраз роднага Ільіча—стваральніка партыі і Савецкай дзяржавы, правадыра, што падрыхтаваў рэвалюцыю, якая «патрэсла свет». Нам дарагі кожны дакумент, які хаця б у некаторай ступені ўваскрашае перад намі жыццё гэтага цудоўнага чалавека. Таму не дзіва, што студэнты падоўгу спыняюцца перад стэндамі выстаўкі, арганізаванай кабінетам палітэканоміі і прысвечанай жыццю і дзейнасці У. І. Леніна.

Стэнды наглядна паказваюць жыццёвы шлях правадыра, яго дзейнасць па стварэнню партыі, гады эміграцыі. З цікавасцю разглядаюць студэнты вокладкі першых выданняў прац геніяльнага мысліцеля. А вось ілюстрацыі, што паказваюць дзейнасць Уладзіміра Ільіча ў гады грамадзянскай вайны, вось ілюстрацыі да плана ГОЭЛРО.

Стэнды выстаўкі дазваляюць больш наглядна прадставіць шлях барацьбы і перамог, які прайшла наша партыя пад кіраўніцтвам У. І. Леніна, уваскрашаюць гераічныя старонкі жыцця і дзейнасці гэтага вялікага чалавека.

**В. ДЫМОЎСКІ.**

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

# КАМУНІСТЫ УНІВЕРСІТЭТА АБМЯРКОЎВАЮЦЬ ВАЖНЫЯ ПЫТАННІ

На чарговым агульнауніверсітэцкім партыйным сходзе сакратар АК КПБ тав. Кузьмін зрабіў даклад аб выніках XXIV з'езду Кампартыі Беларусі. Дакладчык пазнаёміў прысутных з рашэннямі з'езду ў галіне далейшага развіцця прамысловасці, сельскай гаспадаркі, культуры. Галоўную ўвагу ён звярнуў на задачы прафесарска-выкладчыцкага калектыва універсітэта ў паляпшэнні падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў і распрацоўцы важнейшых праблем камуністычнага будаўніцтва.

Выступаўшыя ў спрэчках камуністы падзяліліся вопытам навуковай і выхаваўчай работы на факультэтах, на курсах і ў студэнцкіх групах. Былі ўскрыты недахопы ў дзейнасці калектыва выкладчыкаў і студэнтаў, намечаны шляхі іх ліквідавання. Прафесар Міхась Рыгоравіч Ларчанка, дэкан філалагічнага факультэта, у сваёй прамове звярнуў увагу камуністаў на неабходнасць паляпшэння якасці лекцый. Ён заклікаў выкладчыкаў творча падыходзіць да чытання праграмнага матэрыялу, менш карыстацца канспектам у час лекцыі, а пераўтвараць яе ў жывую размову са студэнтамі аб важнейшых праблемах навукі.

Дэкан біялагічнага факультэта тав. Пятровіч гаварыў аб неабходнасці ствараць ва універсітэце новыя кафедры і лабараторыі для распрацоўкі праблем біялагічнай навукі, аб неабходнасці правядзення міжвузаўскіх пасяджэнняў. Намеснік загадчыка кафедры гісторыі КПСС тав. Сікорскі ўказаў на неабходнасць расшырэння аспірантуры па грамадскім дысцыплінам у сувязі з тым, што рэзка ўзрастае патрэбнасць у кваліфікаваных кадрах па гісторыі КПСС, палітычнай эканоміі, філасофіі. Дэкан гістарычнага факультэта тав. Савачкін звярнуў увагу на работу са студэнтамі, якія прышлі ва універсітэт з вытворчасці і з радоў Савецкай Арміі, на тое, што ім патрэбна з першага курса прывіваць навыкі самастойнай працы. Тав. Старавойтаў спыніўся на пытаннях эстэтычнага і культурнага выхавання студэнтва.

Усяго ў спрэчках выступіла 13 чалавек.

Сход прыняў разгорнутую пастанову, накіраваную на паляпшэнне работы партыйнай арганізацыі.

**Р. ПЛАТОНАЎ.**

